УДК 947.6 «1955/1965»

# СТАНОВІШЧА КАТАЛІЦКАЙ ЦАРКВЫ Ў БЕЛАРУСІ Ў СЯРЭДЗІНЕ 1950-Х – ПАЧАТКУ 1960-Х ГГ. (НА ПРЫКЛАДЗЕ ВІЦЕБСКАЙ ВОБЛАСЦІ)

**Юргевіч Н. К.**
УА "Віцебская дзяржаўная акадэмія ветэрынарнай медыцыны"
г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь

РЕПОЗИТОРИЙ ГГАУ

Мэта даследавання – на аснове архіўных матэрыялаў і навейшых публікацый паказаць дзяржаўную палітыку ў Беларусі ў адносінах да каталіцкай царквы ў сярэдзіне 1950-х – пачатку1960-х гг.

У разглядаемы перыяд каталіцкая царква ў Беларусі знаходзілася ў цяжкім становішчы. Частка храмаў пуставала па прычынах аварыйнага стану ці адсутнасці святара, іншыя будынкі былі перададзены пад сховішчы для калгасаў і саўгасаў ці прыстасаваны пад культурна-асветныя ўстановы, рэлігійным абшчынам часта адмаўлялі ў рэгістрацыі, рамонце будынка і інш. [5, арк. 24], [6, арк. 9], [8, арк. 1]. Акрамя закрыцця касцёлаў, мясцовымі ўладамі праводзілася праца па знішчэнні рэлігійных будынкаў і храмаў [4, арк. 1-8]. Так, 29 лістапада 1961 г. у г. Гродна быў узарваны касцёл Фара Вітаўта (XIV ст.) [2]. Колькасць каталіцкіх абшчын у Беларусі, як і абшчын праваслаўнай царквы, з 1959 па 1966 гг. рэзка зменшылася. На пачатак 1966 г. дзейнічала 128 абшчын каталіцкага веравызнання (з іх 88 толькі ў Гродзенскай вобласці), праз год іх засталося адпаведна 108 і 65 [1].

З 1959 г. узмацніліся меры па абмежаванні дзейнасці каталіцкага духавенства, якому было забаронена праводзіць работу сярод моладзі і дзяцей, выязджаць для суправаджэння нябожчыкаў на могілкі, ездзіць па населеных пунктах (акрамя споведзі цяжка хворых), калядаваць, асвячаць жыллё і гаспадарчыя будынкі вернікаў [7, арк. 12-13]. Для правядзення выхаваўчай справы і рашэння гаспадарчых пытанняў сярод прыхаджан усё больш выкарыстоўваўся касцельны актыў.

Праблемай для мясцовых улад пасля XX з'езда КПСС (1956 г.) з'явілася павелічэнне колькасці ксяндзоў, якія вярнуліся ў рэспубліку пасля заключэння. Многія святары так і не атрымалі дазвол на рэгістрацыю, вымушаны былі шукаць сабе іншае месцажыхарства і працу [3]. Але і тым, хто атрымліваў рэгістрацыю, працаваць станавілася ўсё складаней.

Адзначым, што пасля II Ватыканскага сабору (11.10.1962 – 8.12.1965 г.) адкрыўся новы этап у гісторыі каталіцкай царквы – этап яе дэмакратызацыі, рэфармавання, скіраваны не толькі на збліжэнне з вернікамі, але і з навакольным светам. Значнае месца ў пропаведзях святары адводзілі працы – не толькі маральнаму, але і рэлігійнаму

абавязку вернікаў, асуджалі п’янства, рабілі акцэнты на шлюб і сямейныя каштоўнасці, ролю бацькі ў выхаванні дзяцей, аб чым атэістычная прапаганда гаварыла мала. Дарэчы, асобныя святары пачалі праводзіць набажэнствы на беларускай мове [2].

Трэба зазначыць, што цэнтральнай задачай партыі станавілася камуністычнае выхаванне насельніцтва, асабліва моладзі. З 1957-1958 гг. на гістарычных факультэтах вышэйшых устаноў рэспублікі пачаў выкладацца курс атэізму. Пры ўсіх абкамах і райкамах рыхтавалі лектараў, якія выступалі з лекцыямі і дакладамі па антырэлігійнай і навукова-тэхнічнай тэматыцы. З сярэдзіны 1960-х гг. прадугледжвалася ўвядзенне ва ўніверсітэтах, медыцынскіх, сельскагаспадарчых і педагагічных інстытутах выкладанне курса “Асновы навуковага атэізму” са здачай экзамена, а ў астатніх ВНУ быў уведзены факультатыўны курс. У шэрагу ВНУ ствараліся кафедры навуковага атэізму. Такія дзеянні дзяржавы былі накіраваны на ўкараненне ў грамадстве атэістычнага выхавання, што падаўляла рэлігійныя свабоды людзей і ставіла ў цяжкае становішча вернікаў усіх канфесій [3].

Такім чынам, перыяд хрушчоўскай “адлігі” з’явіўся адным з цяжкіх у жыцці канфесій у Беларусі. З аднаго боку, дзяржаўная палітыка была накіравана супраць носьбітаў рэлігійнасці, на ўзмацненне атэістычнай прапаганды і культурна-асветнай работы сярод насельніцтва. З другога боку, ва ўмовах антырэлігійнай барацьбы каталіцкая царква прыстасоўвалася да складанасцяў, што было вынікам канфесійнай палітыкі дзяржавы ў Беларусі ў канцы 1950-х – сярэдзіне 1960-х гг.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Беларусь на мяжы тысячагоддзяў / І. М. Абрамаў [і інш.]. – Мінск, 2000. – 432 с.
2. Лыч, Л. Гісторыя Беларусі: у 6 т. Т. 6. Беларусь у 1946 – 2009 гг. / Л. Лыч, М. Касцюк, У. Навіцкі; рэдакцыйная калегія: М Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2011. – 728 с.
3.Канфесіі на Беларусі (к. 18 – 20 стст.) / В. В. Грыгор’ева [і інш.]; навуковы рэдактар У. І. Навіцкі. – Мінск, 1998. – 340 с.
4. Уполномоченный Совета по делам религиозных культов при Совете Министров СССР по Витебской области. 07.01.1955 г. – 03.12.1955 г. // Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці (ДАВВ). – Фонд 4029. – Воп. – 1. – С. 6.
5. Уполномоченный Совета по делам религиозных культов при Совете Министров СССР по Витебской области. 1956-1957 гг. // ДАВВ. – Фонд 4029. – Воп. – 1. – С. 7.
6. Уполномоченный Совета по делам религиозных культов при Совете Министров СССР по Витебской области. 1958 г. // ДАВВ. – Фонд 4029. – Воп. – 1. – С. 9.
7. Уполномоченный Совета по делам религиозных культов при Совете Министров СССР по Витебской области. 1961 г. // ДАВВ. – Фонд 4029. – Воп. – 1. – С. 13.
8. Уполномоченный Совета по делам религиозных культов при Совете Министров СССР по Витебской области. 1960 г. // ДАВВ. – Фонд 4029. – Воп. – 1. – С. 12.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГТУ